# ГЕНДАРНАЯ АСІМЕТРЫЯ І ГЕНДАРНЫЯ СТЭРЭАТЫПЫ Ў ТВОРАХ І. ШАМЯКІНА

**Т. А. Фіцнер**

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны,*
*вул. Савецкая, 104, 246019, Гомель, Беларусь, fitsnerik@yandex.ru*

Арыкул прысвечаны разгляду стэрэатыпаў мужчынскасці і жаноцкасці ў раманах і аповесцях выдатнага беларускага пісьменніка Івана Шамякіна. Напачатку асвятляецца паняцце гендара ў дачыненні да літаратуры. На падставе аналізу твораў паказана, што творчасць Івана Шамякіна прэзентуе (фіксуе) гендарныя стэрэатыпы савецкага і постсавецкага грамадства, прасочвае іх эвалюцыю ў працэсе развіцця беларускага грамадства.

***Ключавыя словы***: Іван Шамякін; творчасць; гендар; гендарная асіметрыя; гендарныя стэрэатыпы.

«Пісьменнікам сучаснай тэмы» слушна назваў у свой час І. Шамякіна В. Каваленка. Сапраўды, на працягу больш чым паўстагоддзя пісьменнік мастацкім словам асвятляў сучаснае яму жыццё краіны і народа (ва ўсякім разе пэўнай яго часткі) і стварыў мноства запамінальных гендарных стэрэатыпаў. Пад гендарнымі мы разумеем адпаведна стэрэатыпы мужчынскасці і жаноцкасці, створаныя культурай і літаратурай у прыватнасці, часта вельмі трывалыя, але здольныя змяняцца. Часцей яны ўспрымаюцца як норма абодвума паламі, і ў гэтым іх «жывучасць». Паняцці «мужчынскасць» і «жаноцкасць» улічваюць як знешнасць чалавека, так і яго характар, духоўнасць, а таксама цялеснасць. Стэрэатыпы могуць (і павінны) быць шматлікімі і разнастайнымі ў пэўным грамадстве нават у адзін і той жа час. Пры гэтым у соцыуме заўсёды існуюць дамінуючыя стэрэатыпы

мужчынскасці і жаноцкасці. Задумацца не над зададзенымі адрозненнямі «паміж жаночым і мужчынскім», а «над значэннем, што прыпісваецца гэтым адрозненням», дапамагае, на думку Р. Хоф [1], менавіта паняцце «гендар» (сацыякультурны пол) і гендарныя даследаванні.

Так, у знакамітым праграмным рамане «Сэрца на далоні» [2] І. Шамякін адлюстраваў гендарныя стэрэатыпы савецкага грамадства 60-х гадоў мінулага стагоддзя – стэрэатыпы «мужчынскасці» і «жаноцкасці», падаў сваю мадэль узаемаадносін паміж поламі.

Наогул суадносіны «мужчынскага» і «жаночага» ў шматлікіх раманах І. Шамякіна выяўляюць відавочную перавагу першага (вобразы, сацыяльныя ролі, праблемы). Эвалюцыя гендарных стэрэатыпаў у раманах падкрэслівае не столькі зменнасць грамадскіх стэрэатыпаў, колькі зменнасць аўтарскага погляду на іх. Пры гэтым назіраецца наступная заканамернасць: І. Шамякін, у многім ідэалізуючы галоўныя мужчынскія вобразы (Яраша («Сэрца на далоні»), Карнача («Атланты і карыятыды»), робіць гэта за кошт жаночых (адпаведна Галіны Адамаўны і Дашы). Часам здараецца наадварот – адмоўныя чалавечыя якасці Бародкі («Крыніцы») падкрэсліваюць высакароднасць душы яго жонкі Алены Сямёнаўны. У раманах І. Шамякіна прысутнічаюць як ярка выражаныя гендарныя стэрэатыпы, так і неакрэсленыя або яшчэ не сфармаваныя. Апошняе тычыцца прадстаўнікоў малодшага пакалення ў творах пісьменніка.

Цікавыя стэрэатыпы мужчынскасці і жаноцкасці прадстаўлены і ў аповесцях І. Шамякіна. Па іх можна прасачыць адрозненне грамадскіх стэрэатыпаў і нормаў паводзін у савецкім і постсавецкім грамадстве. Так, у аповесцях пра Вялікую Айчынную вайну вядучым з’яўляецца стэрэатып жанчыны-змагаркі, якая ахвяруе сваім жыццём у імя перамогі над ворагам. Пры гэтым матывы самаахвярнасці вар’іруюцца – гэта і свядомая ўстаноўка на змаганне («Шлюбная ноч»), і пачуццё кахання да мужчыны («Гандлярка і паэт»). Пазней пад увагу аўтара падпадае стэрэатып жанчыны-бунтаркі («Ах, Міхаліна, Міхаліна...»), якая змагаецца за права кахаць і быць каханай (праўда, аб’ект кахання – школьны завуч – не

апраўдвае спадзяванняў галоўнай гераіні: не можа абараніць сваё каханне, баіцца жонкі і грамадскага (партыйнага) асуджэння). Бунтарства ў дадзеным выпадку праяўляецца ў непрыняцці маральных установак грамадства, што рэгламентуюць узаемаадносіны паміж поламі.

Што да аповесцей І. Шамякіна постсавецкага перыяду, то аўтар, апісваючы сучаснасць, адлюстроўвае і тое новае, што ў ёй з'яўляецца. У аповесцях назіраецца рэзкая змена грамадскіх стэрэатыпаў, што адбылася пад уплывам сацыяльных перамен у краіне. Пісьменнік падае:

– стэрэатып жанчыны дзейснай, якая вымушана з дзецьмі выжываць ва ўмовах хаосу і разладу напрыканцы XX ст. («Палеская мадонна»), у той час, як муж дбае толькі пра сябе – запівае жыццёвую неўладкаванасць гарэлкай;

– стэрэатып жанчыны-творцы: сталай актрысы, народнай артысткі, незапатрабаванай грамадствам («Адна на падмостках»), жыццё якой прайшло на сцэне, а ў выніку пенсіі не хапае, каб пракарміць сябе і ката – адзіную родную «жывую душу»; таленту і здароўя ў Аляксандры Паўлаўны хапае, каб зарабіць сабе на хлеб, аднак для яе няма роляў у тэатры; усё ж жанчына вырашае не здавацца – іграе «адна на падмостках» сваё жыццё;

– прасочвае маральнае здрабненне грамадскіх стэрэатыпаў і выяўляе безадказнасць людзей за свой лёс і жыццё сваіх блізкіх («Падзенне»): галоўны герой, адчуўшы смак грошай і свабоды, падчас любоўнага захаплення, «прыдбаў» СНІД; яго жонка, пасля запрашэння з паліклінікі абследавацца, выкідваецца з балкона.

З вышэйсказанага вынікае, што маральная дэградацыя найбольш характэрна мужчынскім вобразам аповесцей названага перыяду.

Больш падрабязна прааналізуем раман І. Шамякіна «Сэрца на далоні». У гэтым творы пісьменнік адлюстраваў, акрамя гендарных стэрэатыпаў савецкага гарамадства 60-х гадоў мінулага стагоддзя, і гендарную асіметрыю тагачаснага гарамадства. Яна праявілася ў тым, што жанчыны, хоць і з'яўляюцца прадстаўніцамі пэўнай прафесіі, падаюцца найперш як носьбіты сацыяльных жаночых роляў: жонкі, маці і вызначаюцца праз адносіны

да мужчыны. Нягледзячы на той факт, што ў творы большасць жаночых вобразаў мае прафесію і працуе, яны не раскрыты як прадстаўнікі пэўнай прафесіі. Напрыклад, Валянціна Андрэеўна, жонка Шыковіча, па прафесіі настаўніца, працуе ў школе, але чытачу не дадзена магчымасць ацаніць яе прафесійныя якасці, пабачыць яе падчас ўрока. У той час як мы маем магчымасць назіраць за работай яе мужа, журналіста Шыковіча, ці «прысутнічаць» на аперацыі, якую праводзіць Яраш. Тое ж мы можам сказаць і пра калегу Яраша Тамару Гаецкую. Больш таго, аўтар наўмысна невысока ацэньвае яе як хірурга, адно адзначае арганізатарскія здольнасці доктара Гаецкай і акцэнтуе ўвагу на яе ўзаемаадносінах з Ярашам, аб чым будзе сказана ніжэй.

І. Шамякін канстатуе, што і ў 60-я гады мінулага стагоддзя класавае/ сацыяльнае вызначэнне жанчыны апасродкаванае. Мужчыны ж у творы найперш раскрыты як прадстаўнікі пэўнай прафесіі ці ўладных структур: Яраш – хірург, Шыковіч – журналіст, Гукан – кіраўнік. І толькі потым як носьбіты сацыяльных мужчынскіх роляў – як мужы, бацькі. Выключэнне ў рамане хіба складаюць вобразы медсясцёр Машы і Клаўдзіі Сухадол, якія дзейнічаюць найперш як прадстаўніцы пэўнай прафесіі.

Скіруем сваю ўвагу на жаночыя вобразы рамана, шматлікія, але далёка не другарадныя, як можа падацца на першы погляд, выявім аўтарскі/ мужчынскі погляд на прадстаўніц прыгожай паловы чалавецтва. Хоць жанчын у рамане прадстаўлена многа, можна вылучыць два асноўныя стэрэатыпы паводзін, два тыпы жанчын/ жаноцкасці: «жанчына-сябар» і «жанчына-ахвяра», ёсць яшчэ адзін тып – «не вызначаны, не акрэслены».

Да першага тыпу адносіцца Валянціна Андрэеўна, жонка Шыковіча. Іх сямейныя ўзаемаадносіны пабудаваны на ўзаемапавазе, узаемаразуменні, даверлівасці, каханні, роўнасці. Гэта (з мужчынскага пункту гледжання) самы высокі статус жанчыны – быць сябрам, быць роўнай. Валянціна Андрэеўна рэалізавалася ў жыцці і як жонка, і як маці, і як настаўніца, таму не камплексуе, не рэфлексуе наконт сваёй другараднасці і знешняга вобліку, а жыве ў згодзе з сабой і грамадствам: яна спакойная і шчаслівая,

радуецца жыццю ва ўсіх яго праявах, нягледзячы на некаторыя сямейныя праблемы.

Зусім іншая ў творы Галіна Адамаўна, жонка Яраша. Яна найбольш яркая прадстаўніца другога тыпу (ахвяра, пакутніца). У гэтай жанчыны за жыццё выпрацаваўся комплекс непаўнацэннасці, які яна выказвае наступнымі словамі: «*Ты вялікі вучоны. А я? Кухарка твая, служанка… Нянька тваіх дзяцей*» [2, с. 65]. І сапраўды, Галіна Адамаўна жыве жыццём мужа (чым большае яго слава, тым мізэрней яна сябе адчувае) і дзяцей, а не сваім асабістым. Што прыводзіць яе да сляпой рэўнасці, нават псіхозу. У кожнай жанчыне яна бачыць суперніцу, здольную адабраць мужа і тым разбіць яе сямейнае шчасце, дабрабыт, жыццё ўвогуле (такое залежнае ад мужа). Па гэтай прычыне яркай рысай яе характару становіцца ўласніцтва, Галіна Адамаўна баіцца страціць мужа, ад няўпэўненасці ў сабе яна ўвесь час патрабуе ад яго доказаў кахання. Пісьменнік рэалістычна намаляваў такі тып паводзін жанчыны, але ніякім чынам не патлумачыў іх прычыны. Слушнае тлумачэнне ў дадзеным кантэксце, на наш погляд, дае французская пісьменніца і філосаф С. дэ Бавуар: «У жанчыне першапачаткова закладзены тыя ж патэнцыі, тыя ж здольнасці да праяўлення свабоды волі, да трансцэндэнтнасці і самаразвіцця, што і ў мужчыне. Іх падаўленне ламае жаночую асобу, не дазваляе ёй адбыцца, здзейсніцца ў якасці чалавека. Канфлікт паміж першапачатковай (дадзенай ад нараджэння) здольнасцю быць суб’ектам і навязанай роляй аб’екта чужой улады і вызначае спецыфіку «жаночай долі» [3, с. 15]. Душэўныя пакуты і пачуццё віны ў Галіны Адамаўны ад жадання адпавядаць агульнапрынятаму ў грамадстве стэрэатыпу жаноцкасці (добрая жонка, маці і гаспадыня) і, адначасна, пратэсту супраць яго. Пазіцыя пісьменніка ў дачыненні да жонкі Яраша дваістая: ён падкрэслівае, што Галіна Адамаўна – жанчына добрая і Антон яе кахае, аднак сам ёю далёка не захапляецца. Аўтарскае стаўленне да гераіні добра адлюстравана ў наступным выразе: «*не сказала, а прашыпела*» [2, с. 63]. Такое, даволі традыцыйнае, параўнанне сведчыць пра тое, што жонка (якая павінна быць маўклівая, пакорлівая і прымаць мужа такім, якім ён

ёсць) зусім не разумее свайго выбранніка, выключнага чалавека, псуе яму жыццё, прымушае ўвесь час апраўдвацца за нязздзейсненае.

Да тыпу жанчыны-ахвяры варта аднесці калегу Яраша, галоўнага ўрача адной з бальніц Тамару Гаецкую. Яна са свайго боку дадае добрую лыжку дзёгцю ў сямейнае жыццё Антона Яраша (паралельна павялічваючы яго «мужчынскі статус»). І. Шамякін падкрэслівае, што гэтая жанчына – нікчэмны спецыяліст, хоць і добры арганізатар. Пра яе сямейнае жыццё мы нічога не ведаем, акрамя таго, што ў яе ёсць муж і сын. Сапраўдная і адзіная трагедыя ў жыцці Тамары, як вынікае з тэксту, адбылася ў маладосці, калі Яраш адрынуў яе каханне. Гэтага яна не можа ні зразумець, ні прыняць многія гады. Як сталася так, што яна не лепшая, не адзіная? Па гэтай прычыне яна помсціць доктару сваімі «нахабнымі заляцаннямі», парушаючы такім чынам яго сямейны спакой. А можа, усё яшчэ заваёўвае яго? Ва ўсякім разе помслівасць становіцца яркай рысай яе характару. Каханне для жанчыны тыпу Гаецкай стаіць (на погляд аўтара) на першым месцы, а няспраўджанасць гэтага пачуцця вядзе да дэградацыі жаночай асобы.

Да «нявызначанага» тыпу адносяцца Маша і Зося, хаця яны вельмі розныя і не належаць да аднаго пакалення. Аб'ядноўвае гэтых гераінь тое, што яны пакуль недасягальныя, нічые, не праявіліся як жонкі і маці. Яны, пакуль, ні на кога не «шыпяць», таму іх абагаўляюць, што выразна выявілася ў словах, якімі мужчыны характарызуюць Машу. Напрыклад: *«дзівосная жанчына», якая вось-вось узнімецца і паляціць на іншую планету, з якой з'явілася»* [2, с. 50] – Яраш; *«Вы ж незямная... Я сніў марсіянак. І ўсе яны падобны на вас»* [2, с. 161] – Славік; Тарас *«разглядае госцю, як нейкае дзіва»* [2, с. 153].

Для Зосі, у адрозненне ад Машы, вельмі многае засталося ў мінулым. Яе магчымасці страчаны па прычыне ўсё той жа другараднасці ролі жанчыны ў грамадстве. Яе лёс залежаў ад мужчын: бацькі, Гукана, Шыковіча і Яраша. Смерць бацькі аказалася трагічнай і ў тым сэнсе, што дзяўчына-падлетак засталася адна, неабароненая перад вайной (жыла ізалявана, за бацькавай спінай пасля смерці маці) і заціснутая паміж дзвюма жахлівымі сістэмамі:

фашызмам і сталінізмам, якія і распарадзіліся лёсам гэтага зусім яшчэ дзіцяці. А прадстаўнікі сістэмы ў творы – зноў жа мужчыны. Так, Гукан, які ў час вайны хаваўся ад фашыстаў у доме доктара Савіча, каб не скампраметаваць сябе сувяззю з «ворагам», сваёй ананімкай «адпраўляе» Зосю, якая прыехала ў родны горад з нямецкага канцлагера, у савецкі лагер. Доктар Яраш і журналіст Шыковіч «выпраўляюць памылкі» лёсу Зосі Савіч, спрыяюць яе поўнай рэабілітацыі. А хірург Яраш вяртае яе да жыцця не толькі фізічна, але і духоўна. Наступная цытата вельмі добра паказвае, што зрабіла сістэма з гэтай жанчынай: «*Цяпер Яраш лёгка пазнаваў рысы* (твару – Т. Ф.) *той Зосі, якая некалі смела і дзёрзка схавала яго. Але яму хацелася ўбачыць рысы і таго ж характару. Няхай бы бліснула хоць адна іскра яе дзёрзкасці, рашучасці, весялосці, дасціпнасці, хітрасці. Не, усё задушана, нават хітрасць. Адно хіба свяцілася ў яе вачах – захапленне ім, Ярашам. Але і яно было зусім інакшае, чым тады, нейкае рабскі-пакорлівае*» [2, с. 145–146]. Сама ж Зося зазначае пра сваё жыццё: «*Хіба я жыла!*» [2, с. 147]. Доктар Яраш сапраўды зрабіў немагчымае, бо пазней у лісце да яго сапраўдная (а не ўяўная) пакутніца і самая высакародная з жаночых вобразаў рамана Зося Савіч напіша: «*Я не памру. Цяпер я не памру. Цяпер мне вельмі хочацца жыць, калі я паверыла, убачыла, што навокал многа добрых, сардэчных людзей і свет такі прыгожы*» [2, с. 424].

Жанчына праяўляецца не толькі ў адносінах з мужчынамі, а і праз адносіны з іншымі жанчынамі (І. Саўкіна [4]). Зося, бясспрэчна, напрыканцы рамана акрэпла і фізічна, і духоўна і ўсё ж вымушана зноў пакінуць горад і адправіцца яшчэ ў адну «ссылку». Бо цяпер яна стала ворагам для жанчын, уяўных пакутніц – Галіны Адамаўны і Тамары Гаецкай. Ворагам таму, што прыцягвае ўвагу Яраша і, як жанчына вольная, нясе пагрозу і жонцы, і няспраўджанай каханцы (жанчыны кансалідуюцца супраць Зосі, маецца на ўвазе ліст Гаецкай да жонкі Яраша). Такім чынам, жанчыны, пакутуючы ад створаных у грамадстве стэрэатыпаў «жаноцкасці», самі навязваюць такі стэрэатып кожнай з жанчын. Калі ж жанчына выходзіць за рамкі стэрэатыпу, то яна становіцца

чужой, ворагам. Самі жанчыны пачынаюць цкаваць яе, выжываць, абараняючы сябе, свой дабрабыт, што залежыць ад мужчыны, сваю прастору.

Набліжаны да Зосі вобраз Клаўдзіі Сухадол, якая працавала падчас вайны медсястрой у доктара Савіча. Смерць апошняга аказалася вырашальнай і ў яе жыцці. Яе лёс – гэта лёс жанчыны на вайне, лёс жанчыны ў патрыярхальным грамадстве, таталітарнай дзяржаве, дзе мужчыны таксама даволі часта аказваюцца безабароннымі.

Падсумоўваючы, зазначым, што творчасць І. Шамякіна прэзентуе/ фіксуе гендарныя стэрэатыпы савецкага і постсавецкага грамадства, прадстаўляе іх множнасць, прасочвае іх эвалюцыю ў працэсе развіцця беларускага грамадства.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. Хоф Р. Возникновение и развитие гендерных исследований // Пол. Гендер. Культура. Немецкие и русские исследования. М.: Российский государственный гуманитарный университет, 1999. С. 23–47.

2. Шамякін І. Сэрца на далоні // Выбраныя творы: У 3 т. Мінск: Маст. літ., 1992. Т. 1. С. 17–427.

3. Бовуар де С. Второй пол / Т.1 и 2: Пер. с фран. / Общ. ред и вступ. ст. С. Г. Айвазовой, коммент. М. В. Аристовой. М.: Прогресс; СПб.: Алетейя, 1997.

4. Савкина И. «Чужое – мое сокровище»: женские мемуары как автобиография («Воспоминания» С. В. Капнист-Скалон) // Гендерные исследования. 1999. № 2. С. 178–205.